УДК 323.1(476) + 930.1(476)

***Крэнт Дз. А.***
Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук,
прафесар Тугай У. В.

# ЛАТЫШСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ МЕНШАСЦЬ У БССР У ДАСЛЕДАВАННЯХ КАРЛА ШКІЛЬТЭРА

Праца прысвечана асвятленню навуковых поглядаў гісторыка К. Шкільтэра ў дачыненні да вывучэння латышскага насельніцтва БССР. У артыкуле вылучаны формы навуковай дзейнасці даследчыка, зроблены акцэнт на аглядзе яго аналітычных работ. Прааналізаваны спробы К. Шкільтэра пашырыць прадметнае поле даследаванняў па праблеме латышскай нацыянальнай меншасці ў БССР.

*Ключавыя словы:* гістарыяграфія, Латышскі сектар БАН, латышы, нацыянальная меншасць, Карл Шкільтэр.

The research is devoted to the coverage of the scientific views of the historian K. Schkilter regarding the study of the Latvian population of the BSSR. The article identifies the forms of scientific activity of the researcher, emphasis is placed on examining his analytical work. The attempts of K. Schkilter to expand the subject field of the research on the problem of the Latvian national minority in the BSSR are analyzed.

*Keywords:* historiography, Latvian sector of the Belarusian Academy of Sciences, Latvians, national minority, Karl Schkilter.

Нацыянальная палітыка ў БССР, што здзяйснялася на працягу 1920 – першай паловы 1930-х гг., у значнай ступені садзейнічала ўключанасці ва ўсе сферы жыцця краіны іншанацыянальных элементаў, якія пражывалі на абшарах Савецкай Беларусі. Апошняе датычылася і навуковай дзейнасці, пра што сведчыць арганізацыя шэрагу даследчых адзінак па вывучэнню культуры, мовы і гісторыі наступных нацыянальных меншасцей: латышоў, літоўцаў, палякаў і яўрэяў пры Інстытуце беларускай культуры (з 1929 г. Беларуская Акадэмія навук).

Развіццё ўласна латышскіх даследаванняў на Беларусі ў адзначаны перыяд было звязана з дзейнасцю Латышскага камісіі (з 1931 г. Латышскі сектар, з 1935 г. Латышская секцыя пралетарскай культуры Інстытута нацыянальных меншасцей. – *Дз.К.*) БАН і яе загадчыка Карла Юр'евіча Шкільтэра. Не гледзячы на цікавасць шэрагу навукоўцаў да гісторыі латышскага насельніцтва Беларусі, даследчыцкая спадчына К. Шкільтэра асвятлялася павярхоўна і фрагментарна. Найбольш грунтоўная спроба ў гэтым плане належыць У.Тугаю, які ў сваёй манаграфіі ахарактарызаваў галоўныя выданні якія выйшлі з-пад пяра даследчыка. Так, У. Тугай канстатуе: "…Перавага ў кнігах К. Шкільтэра навукова-збіральніцкай работы, недастатковыя клопаты аб сінтэзе матэрыялу выклікалі справядлівае пачуццё недапрацаванасці работы…" [4, с. 4]. Даследчык М. Каралёў лічыць, што не гледзячы на ідэалагічны складнік, работы К. Шкільтэра адрозніваюцца наяўнасцю навуковага падыходу, у параўнанні з іншымі працамі, якія выходзілі па гісторыі латышоў у БССР у 1920–1930 гг. Гісторык звяртае ўвагу, што дадзенныя работы маюць дваісты характар, і могуць у сучасным даследаванні разглядацца як гістарыяграфія, так і як крыніцы [2, с. 59–60].

Цікавасць даследчыка да праблемы латышскай нацыянальнай меншасці была звязана з дзейнасцю Латышскай секцыі пры ЦК ВКП (б). Менавіта па ініцыятыве яе кіраўніцтва ў лістападзе 1926 г. была арганізавана Цэнтральная камісія па даследаванні латышскіх калоній СССР у г. Маскве. У склад апошняй, як яе сакратар, увайшоў і К. Шкільтэр. Камісіяй былі папярэдне вылучаныя рэгіёны, у якіх кампактна пражывала латышскае насельніцтва, адзначаныя накірункі працы ў сферы вывучэння гісторыі латышоў СССР. У рэгіёнах кампактнага пражывання памянёнай нацыянальнай меншасці планавалася арганізаваць даследчыя ўстановы [7, арк. 2].

У межах працы адзначанай камісіі даследчыкам была падрыхтавана і выдадзена ў 1928 г. на латышскай мове кніга "Гісторыя латышскіх калоній" па праблеме перасялення латышскага насельніцтва на тэрыторыі Расійскай імперыі. Адзначаная работа з'яўлялася першым томам у запланаваным шматтомніку па гісторыі латышоў у СССР. Нажаль, памянёнае даследаванне К. Шкільтэра на дадзены момант з'ўляецца бібліяграфічнай рэдкасцю [10, с. 4].

Мэтанакіраванае вывучэнне латышскага насельніцтва Савецкай Беларусі даследчыкам было звязанае з яго сталым пераездам у БССР і працай у Латышскай камісіі ІБК. Першай задачай да якой прыступіў навуковец, стаў збор факталагічнага матэрыялу па гісторыі латышоў Беларусі. У сувязі з гэтым К. Шкільтэр спрыяў надрукаванню ў часопісе "Наш край" артыкула К. Мартэсона па праблеме збору этнолага-лінгвістычных матэрыялаў сярод латышскага насельніцтва БССР [3; 7, арк. 83]. У 1929 г. гісторыкам асобнай брашурай была выдадзена праграма па даследаванні латышскіх калоній. Галоўны акцэнт у праграме надаваўся выяўленню крыніц па эканамічна-дэмаграфічнаму становішчу латышскіх пасяленняў. Работа мела падкрэслены інструкцыйна-метадычны характар, даследчык заклікаў, каб складальнікі апісанняў латышскіх калоній дасылалі свае матэрыялы на адрас Латышскай камісіі БАН [16]. Тым самым, падрыхтоўка метадычнай літаратуры была скіравана на наладжванне сувязяў з мясцовымі краязнаўчымі гурткамі. Паказальна, што адзначаная работа мела плён, што вынікае са зместу аналітычных работ даследчыка. Так, у працах гісторыка прыводзяцца асабістыя сведчанні латышскіх сялян Барысаўскай і Магілёўскай акруг.

Таксама з мэтай збірання матэрыялаў па гісторыі, этнаграфіі і эканоміцы латышоў па заданні БАН былі наладжаны дзве экспедыцыі на Віцебшчыну і Полаччыну ў 1929 і 1930 гг., якія былі ўзначалены К. Шкільтэрам. Азнаямленне з даведкай аб экспедыцыі Латкамісіі за 1930 г. дазваляе высветліць, якія населеныя пункты былі абследаваны ў 1930 г.: Вацлавова, Белае, Дзюмаўшчына, Тапары-Васількі, Падзёры ў Полацкай акрузе; Поташня, Храповічы, Шульцэва, Обухова, Манулкі ў Віцебскай. У даведцы падкрэслівалася, што галоўнай задачай экспедыцыі 1930-га г. з'яўлялася "…збіранне матэрыялу аб гісторыі эканомікі і быту <…>, а *асабіста а* (так у дакуменце. – *Дз.К.*) ліквідацыі кулацтва і працэсе колектывізацыі ў латыскіх калёніях…" [7, арк. 135].

Экспедыцыі Латышскага сектара таксама ладзіліся ў 1931 і 1935 гг. Аднак апошняя экспедыцыя была скіравана на выяўленне лінгвістычных і фальклорных матэрыялаў, і даследчык у ёй не прымаў удзел [13, с. 5]. Адыход гісторыка ад палявых даследаванняў звязаны з аднаго боку са зменамі навуковых інтарэсаў. На працягу 1932–1933 гг. К. Шкільтэр рыхтаваў працу па гісторыі латгальскага насельніцтва Латвіі, а з 1935 г. ім распрацоўвалася праблема навейшай латышскай гістарыяграфіі. З іншага боку, даследчык меў значную грамадскую занятасць: з'яўляўся членам партыйнага камітэту БАН, інструктарам беларускага аддзялення "Саюза ваяўнічых бязбожнікаў", супрацоўнічаў з МОПР БССР. Адзначаная работа адрывала даследчыка ад навуковай дзейнасці ў некаторых выпадках на некалькі месяцаў [8, арк. 73].

Вынікам даследчай працы К. Шкільтэра стаў выхад некалькіх работ па праблеме латышскага насельніцтва БССР. Храналагічна першай з іх з'ўляецца артыкул "Працэс колектывізацыі ў латыскіх колёніях БССР", які быў змешчаны ў майскім нумары часопіса "Савецкая краіна" за 1931 г. У даследаванні ў агульных рысах ахарактарызаваны працэс калектывізацыі латышскіх гаспадарак, паказаны супярэчлівыя з'явы, якія яго суправаджалі. Заўважны ўплыў артыкула І. Сталіна "Галавакружэнне ад поспехаў" на логіку выкладання матэрыялу работы. Так, даследчык раскрытыкаваў захады кіраўніцтва Быхаўскага раёна па калектывізацыі латышскіх вёсак [12].

Наступным даследаваннем К. Шкільтэра стаў нарыс "Латышскія калоніі на Беларусі: развіццё латышскіх сялянскіх гаспадарак", які выйшаў з друку ў другой палове 1931 г. Даследчык падкрэсліваў, што задачай яго працы з'ўлялася змяніць стаўленне да спосабаў гаспадарання латышскага насельніцтва, якое заклалася ў масавай свядомасці. Падобная задача была абумоўлена наступнай акалічнасцю. У перыяд 1920-х гг. існавала меркаванне аб тым, што латышы з'ўляюцца праваднікамі "культурнай гаспадаркі", да пабудовы якой імкнуўся народны камісар земляробства Дз. Прышчэпаў. Укараненню падобнага



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

пункту гледжання спрыялі і першыя асобы з кіраўніцтва БССР. Так, у 1927 г. падчас наведвання Полацкай акругі А. Чарвякоў зазначаў: "…латышскі сельскі савет добра разумее, што задача латышскіх сялян, як больш культурных (маецца на ўвазе з больш развітай агратэхнікай – Дз.К.), дапамагчы сваім суседзям паставіць і падняць гаспадарку, каб палепшыць іх дабрабыт…" [9, с. 3].

Крыніцазнаўчая база нарыса з'яўлялася надзвычай разнастайнай. Яе саставілі матэрыялы сабраныя падчас экспедыцый Латышскай камісіі БАН 1929 і 1930 гг., звесткі накіраваныя мясцовымі краязнаўчымі гурткамі і дакументы Ленінградскага Цэнтрархіву (зараз Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў – *Дз.К.*). Значную ролю для адзначэння часу міграцыі латышскіх сялян у беларускія губерніі і яе прычын адыгралі матэрыялы перыядычных выданняў, у першую чаргу, якія выдаваліся на латышскай тэрыторыі [11, с. 35].

У метадычным плане К. Шкільтэр у першую чаргу скіраваўся на вывучэнне гаспадарчых адносін у латышскіх пасяленнях БССР, а іншыя пытанні жыцця латышскага насельніцтва закраналіся ім выключна павярхоўна. Абгрунтаванне падобнага ракурсу даследавання можна знайсці ў першай главе нарыса, калі навуковец уступае ў завочную палеміку з латышскім даследчыкам Я. Кордзнэкам наконт прычыны перасяленчага руху з Латвіі : "…сапраўдныя прычыны (перасялення – *Дз.К.*) ні ў якім разе не трэба шукаць у нематэрыялістычных мотывах, – іх трэба шукаць у эканоміцы таго часу…" [11, с. 8]. Працытаваныя радкі выразна ілюструюць, што гісторык у першую чаргу скіраваны на вывучэнне эканамічных адносін у сельскай гаспадарцы, і таму адзначаную цытату варта разглядаць як даследчыцкае крэда К. Шкільтэра ў дачыненні да вывучэння латышскага насельніцтва.

Адсутнасць даследаванняў па гісторыі сельскай гаспадаркі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст., створаных з марксісцкіх пазіцый, вымушала даследчыка засяродзіцца не толькі ўласна на развіцці гаспадарчых адносін латышоў Беларусі, але і на тое, каб даць поўную характарыстыку гісторыі аграрных адносін на Беларусі ў адзначаны перыяд, і ўжо ў гэтым кантэксце асвятляць гісторыю латышскіх пасяленцаў. То бок, даследчык імкнуўся разглядаць не толькі працэсы на мікраўзроўні, а і ўпісваў іх у агульнае гаспадарчае развіццё краю.

Улічваючы, што К. Шкільтэр з'яўляўся прыхільнікам класавай тэорыі грамадства, істотным для яго ў рабоце з'яўлялася падзяліць латышскае насельніцтва, якое рассялілася на тэрыторыі БССР, па эканамічнай прымеце на сельскую буржуазію (кулакоў) і сельскі пралетарыят (батракоў). Па меркаванню аўтара адзначаныя групы латышскага насельніцтва павінны былі весці паміж сабой класавую барацьбу. Аднак у дадзеным выпадку, адсутнасць факталагічнага матэрыялу, які мог пацвердзіць адзначаную з'яву, вымушала даследчыка да таго, каб паказаць класавую напружанасць, карыстацца не навуковай аргументацыяй, а апеляцыяй да "сацыяльнай справядлівасці". Апошняе здзяйснялася пры дапамозе асвятлення бытавых умоваў у якіх пражывала найбольш заможная частка латышскіх сялян [11, с. 151-162]. У якасці напружанасці паміж заможнай і бядняцкай часткамі падаваліся звесткі аб супраціўленні заможных сялян захадам савецкай улады, а таксама іх формамі гаспадарчай дзейнасці. Падобны падыход да работы прывёў да таго, што па-за ўвагай даследчыка апынулася прамежкавая паміж імі эканамічная група сялян, і іх гаспадарчы ўклад даследчыкам амаль не разглядаўся.

На логіку выкладання матэрыялу ў рабоце К. Шкільтэра аказвалі значны ўплыў і грамадска-палітычныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі БССР і СССР у час напісання нарыса. Пра гэта яскрава сведчыць наяўнасць спецыфічнай лексікі ў работах даследчыка, якая ў той час увайшла ў палітычную мову краіны: нацдэмы, прышчэпаўшчына, правыя апартуністы і інш.

Трэба адзначыць, што выхад дадзенай работы з'яўляецца яскравым прыкладам уплыву грамадска-палітычных рэалій на працу тагачаснага даследчыка. Калі звярнуцца да зместу нарыса то можна заўважыць, што прадмова была створана ў студзені 1931 г., з гэтага можна зрабіць выснову, што да гэтага часу быў падрыхтаваны і яго рукапіс. Пра апошняе сведчыць і тое, што рэдактарскія заўвагі былі зроблены С. Матулайцісам у пачатку лютага і ён даваў рэкамендацыю накіраваць кнігу да друку [5, арк. 226-226 адв.]. Азнаямленне са зместам нарыса дазваляе адзначыць, што ў ім апісваліся ў тым ліку падзеі вясны 1931 г. Апошняе сведчыць аб тым, што кніга даследчыкам была дапрацавана пасля таго як яна прайшла рэдактуру. Дапрацоўку працы магчыма звязаць са зменамі ў грамадска-палітычным курсе краіны і ў прыватнасці з выхадам у пачатку сакавіка 1931 г. артыкула і. Сталіна "Галавакружэнне ад поспехаў".

У даследчыка існавалі задумкі на асвятленне не толькі выключна гаспадарчага ўкладу латышоў на Беларусі. К. Шкільтэрам планавалася у 1932 г. выдаць брашуру па праблеме рэлігійнага жыцця латышскага насельніцтва БССР [14, S. 18]. Аднак адзначаная ініцыятыва не была рэалізавана.

Згодна з планам працы Латышскага сектара на 1934 г. даследчык рыхтаваў гістарычны нарыс па тэме "Гаспадарчае і нацыянальна-культурнае будаўніцтва працоўных латышоў БССР" [1, с. 22]. Аднак, выдадзеная ў 1935 г. на латышскай мове манаграфія "Латышскі селянін на Беларусі да і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі" ў значнай ступені паўтарае палажэнні, якія былі апублікаваны ў нарысе 1931 г. [15, lpp. 131–135]. Выключэннем у гэтым плане з'яўляецца тое, што ў апошнім раздзеле кнігі аўтарам былі пададзеныя звесткі аб становішчы латышскага насельніцтва ў перыяд паміж 1931–1934 гг., галоўная ўвага зноў была нададзена працэсу калектывізацыі і развіццю сельскагаспадарчых адносін. Можна заўважыць перамены ў мове даследавання аўтара, што яскрава ілюструюць назвы работ. У працах 1931 г. ужываецца словазлучэнне "латышскія калоніі", то бок галоўны акцэнт робіцца на нацыянальнасць і падкрэсліваецца перасяленчы характар разглядаймага ў рабоце насельніцтва. У манаграфіі 1935 г. у назве працы галоўная ўвага надаецца сацыяльнаму паходжанню латышскага насельніцтва БССР, знікае акцэнт на яго перасяленчым характары.

Апошняй працай навукоўца па праблеме латышскага насельніцтва ў БССР стаў удзел у падрыхтоўцы калектыўнай работы па нацыянальна-культурнаму будаўніцтву сярод нацменшасцей Савецкай Беларусі, выданне якой было запланавана да дваццацігоддзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Даследчыкам сумесна з В. Скардзісам быў падрыхтаваны раздзел па развіццю латышскай і літоўскай нацыянальнай меншасці ў БССР [6, арк. 39]. Далейшая навуковая праца К. Шкільтэра была перарвана ў сувязі з яго арыштам у снежні 1937 г.

Такім чынам, даследчыцкая дзейнасць К. Шкільтэра прывяла да з'яўлення шэрагу прац па вывучэнні латышскай нацыянальнай меншасці ў БССР. Вялікае значэнне гісторыкам надавалася збіранню факталагічнага матэрыялу сярод мясцовага латышскага насельніцтва, пра што сведчыць падрыхтоўка ім метадычнай літаратуры і арганізацыя шэрагу экспедыцый Латышскага сектара БАН пад кіраўніцтвам К. Шкільтэра. Разам з тым мэтазгодна адзначыць, што на метадалагічныя прыёмы і аўтарскія інтэрпрэтацыі, ўжытыя ў аналітычных даследаваннях, аказалі ўплыў грамадска-палітычныя рэаліі, якія ў час яго даследчыцкай дзейнасці панавалі ў краіне. Работы К. Шкільтэра мелі на мэце паказаць гісторыю эканамічнага развіцця латышскіх пасяленняў у БССР, і таму астатнія сюжэты з жыцця латышскага насельніцтва разглядаліся гісторыкам фрагментарна, а ініцыятывы пашырыць прадметнае поле даследаванняў навукоўцам не былі рэалізаваны.

**Літаратура:**


1. Вытворчы план акадэміі навук на 1934 год. – Менск : Выдавецтва БАН, 1934 – 88 с.
2. Каралёў, М. Г. Латышы на беларускіх землях : беларуская гістарыяграфія пытання / М. Г. Каралёў // Латыши и белорусы : вместе сквозь века : сб. науч. ст. Вып. 6 / редкол. : С. П. Кулик [и др.]. – Минск, 2015 – С. 59–62.
3. Мартэнсон, К. Зьбіраньне этнолёгічна-лінгвістычных матар'ялаў сярод латыскага насяленьня БССР / К. Матэрсон // Наш край – 1929. – № 3. – С. 53–54.
4. Тугай, У. В. Латышскі этнас у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі : манаграфія / У. В. Тугай. – Выд. 2-е – Мінск : БДПУ ім. М. Танка, 2003 – 305 с.
5. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей ЦНА НАН Беларусі) Ф. 1. Воп. 1. Спр. 18.
6. ЦНА НАН Беларусі – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 34.
7. ЦНА НАН Беларусі – Ф. 72. – Воп. 1. – Спр. 11.
8. ЦНА НАН Беларусі – Ф. 72. – Воп. 1. – Спр. 13.
9. Чарвякоў, А. Р. Савецкая Беларусь – бацькаўшчына працоўных [Аб дапамозе латышскага насельніцтва беларусам] / А. Р. Чарвякоў // Беларуская вёска – 1927. – 4 верасня. – С. 3.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

10. Чегодаев, Е. А. Латыши Башкортостана : формирование и функционирование этнической группы (конец XIX – начало XXI в.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.07 / Е. А. Чегодаев ; Уфимский науч. центр Рос. акад. наук, Институт этнологических исследований им. Р.Г. Кузеева. – Ижевск, 2015. – 27 с.
11. Шкільтэр, К. Ю. Латыскія колёніі на Беларусі. Гістарычнае разьвіцьцё латыскіх сялянскіх гаспадарак. / К. Ю. Шкільтэр. – Менск : Беларуская Акадэмія навук, 1931. – 271 с.
12. Шкільтэр, К. Ю. Процэс колектывізацыі ў латыскіх колёніях БССР / К. Ю. Шкільтэр // Савецкая краіна. – 1931. – № 5. – С. 48–54.
13. Шкільтэр, К. Ю. Секцыя латышскай пролетарскай культуры / К. Ю. Шкільтэр // Калгасьнік Беларусі. – 1935. – 4 красавіка. – С. 5.
14. Betriebsplan der Weissrussischen Akademie der Wissenschaften für das Jahr 1932: Übersetzung aus dem Weissrussischen. – Minsk : Weissrussische Akademie der Wissenschaften, 1931 – 118 S.
15. Šķilters, K. Latvju zemneeks Baltkreevijā pirms un pēc Oktobra revolucijas: vēsturiska monografija / K. Šķilters. – Minskā : Baltkreewijas Zinatņu Akademijas, 1929. – 143 lpp.
16. Šķilters, K. Latweešu koloniju pētišahas programa / K. Šķilters. – Minskā : Baltkreewijas Zinatņu Akademijas, 1929 – 12 lpp.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова